# НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ!

## Гарачае прывітанне ўдзельнікам XVIII з'езда Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі!


*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Беларускі Універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 15 (1202) ● 27 красавіка 1978 г. Цана 2 кап.




Савецкі народ сустракае свята Першамая ў абстаноўцы небывалага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага прыняццем новай Канстытуцыі СССР — Асноўнага Закона нашай дзяржавы. На заводах і фабрыках, у калгасах і саўгасах, на будоўлях і шахтах шырыцца спаборніцтва за датэрміновае выкананне планаў трэцяга года пяцігодкі. Сотні працоўных калектываў нашай рэспублікі, дзесяткі тысяч рабочых, калгаснікаў, прадстаўнікоў іншых галін сацыялістычнай гаспадаркі вырашылі выканаць гадавое заданне да 7 кастрычніка — гадавіны новай Канстытуцыі СССР.

Экзаменам на палітычную і працоўную сталасць для мільёнаў савецкіх людзей з'явіўся Ленінскі камуністычны суботнік. У гэты дзень краіна атрымала на мільёны рублёў звышпланавай прадукцыі. Выраслі паверхі новых жылых дамоў, зашумелі пад свежым веснавым ветрам дрэвы, высаджаныя ў парках, скверах.

Увесь шматтысячны калектыў нашага універсітэта актыўна ўключыўся ў сацыялістычнае спаборніцтва, прысвечанае 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Юнакі і дзяўчаты нашай ВНУ працуюць творча, з энтузіязмам, настойліва авалодваюць ведамі, вучацца кіраваць грамадскімі справамі.

Разам з савецкімі студэнтамі свята 1 Мая святкуюць і сотні замежных студэнтаў БДУ, для якіх створаны ўсе ўмовы для паспяховай вучобы і добрага жыцця. Гэта яскравы прыклад салідарнасці нашага народа.

Выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты БДУ, якія пройдуць у святочных калонах дэманстрантаў, будуць рапартаваць партыі і народу аб сваіх творчых дасягненнях, пошуках і знаходках.

Са святам Першамая, дарагія сябры!

## Асноўны Закон краіны



### ВАЖНАЯ ВЕХА Ў РАЗВІЦЦІ БССР

З пачуццём велізарнага задавальнення навуковая грамадскасць прымае новую Канстытуцыю БССР. Яе прыняцце стала буйнай гістарычнай падзеяй у жыцці Савецкай Беларусі. Знамянальна і тое, што новая Канстытуцыя БССР прынята ў год 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі, заканадаўча ўвенчвае слаўны юбілей у жыцці нашай рэспублікі.

Неабходнасць у распрацоўцы новай Канстытуцыі БССР выклікалася аб'ектыўнымі прычынамі, ходам гістарычнага развіцця Савецкай дзяржавы і грамадства. Ва ўсіх сферах грамадскага жыцця адбыліся падзеі гістарычнага значэння. Савецкае грамадства ўступіла ў пару сталых сацыялістычных грамадскіх адносін. У нашай краіне пабудавана развітое сацыялістычнае грамадства, паступова перарастаючае ў камуністычнае. Савецкая дзяржава стала агульнанароднай, выражаючай волю і інтарэсы ўсяго народа. Склалася новая гістарычная сацыяльная і міжнацыянальная супольнасць людзей — савецкі народ, у аснове якой ляжыць непарушны саюз рабочага класа, калгаснага сялянства і народнай інтэлігенцыі — пры вядучай ролі рабочага класа.

У савецкім грамадстве развіваюцца працэсы ўзмацнення сацыяльнай аднароднасці, сціраюцца істотныя адрозненні паміж горадам і вёскай, разумовай працай і фізічнай, ідзе далейшае развіццё і збліжэнне нацый і народнасцей СССР.

А. САЧАК,
старшы навуковы супрацоўнік.

### ПРАВА НА ПРАЦУ І АДУКАЦЫЮ ГАРАНТАВАНА

Хочацца выразіць вялікае задавальненне тым, што ў Канстытуцыі атрымала далейшае развіццё палажэнне аб адукацыі, навуцы, мастацтве, аб паляпшэнні ўмоў працы і жыцця савецкага народа. Мы ясна разумеем, што новая Канстытуцыя паслужыць умацаванню справы камунізму, стане яшчэ адным сведчаннем перавагі нашага ладу.

Учытваючыся ў артыкулы новай Канстытуцыі БССР, пранікаешся пачуццём законнага гонару за нашу Радзіму, адчуваеш тыя змены, якія адбыліся ў краіне за мінулыя дзесяцігоддзі. Гэта добра бачна на прыкладзе нашага універсітэта. У распараджэнні студэнтаў — дзяцей працоўных, калгаснікаў, інтэлігенцыі — цудоўныя аўдыторыі, лабараторыі, аснашчаныя самым сучасным абсталяваннем, вучэбныя карпусы, інтэрнаты, спартыўныя пляцоўкі. Гэта яшчэ адно сведчанне нястомнага клопату, які праяўляюць партыя і ўрад аб савецкай моладзі. Неад'емным правам кожнага грамадзяніна СССР з'яўляецца права на адукацыю, усебаковае развіццё сваіх дараванняў. Для нас сталі прывычнымі бясплатная адукацыя, стыпендыі, пуцёўкі ў спартыўныя лагеры і дамы адпачынку. Перад савецкай моладдзю не стаіць праблема, дзе працаваць пасля заканчэння вышэйшай або сярэдняй навучальнай установы. Нашы веды, наш творчы пошук патрэбны краіне. Новая Канстытуцыя — гарантыя шчасця і дабрабыту савецкага народа.

В. ШАЎЧУК,
студэнт.

У сапраўднае свята працы выліўся камуністычны суботнік у нашым універсітэце. Ніхто не застаўся ў баку: зладжана працавалі выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты, аспіранты.

На здымку: студэнты факультэта журналістыкі працуюць на добраўпарадкаванні новага вучэбнага корпуса.

Фота М. Дубовіка.



## СПРАВАЗДАЧУ ТРЫМАЮЦЬ ПАРТГРУПЫ

Цікава і ажыўлена прайшоў справаздачна-выбарны сход у партгрупе кафедры тэорыі функцый механіка-матэматычнага факультэта. Са справаздачным дакладам выступіла партгрупорг, старшы выкладчык кафедры С. Я. Рудакоўская. Яна грунтоўна праанілізавала стан спраў у партгрупе, расказала аб той вялікай рабоце, якая праводзіцца камуністамі па паляпшэнню якасці вучэбнага працэсу, павышэнню эфектыўнасці навукова-даследчай работы супрацоўнікаў і студэнтаў, аб тым укладзе, які робяць камуністы кафедры, у выкананне комплекснага плана ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў, аб барацьбе членаў партыі за выкананне высокіх сацыялістычных абавязацельстваў, узятых у гонар 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.

Даклад быў выслуханы з вялікім інтарэсам. З 12 камуністаў партгрупы ў спрэчках выступілі 10 чалавек. Выступаючыя адзначылі дасягненні ў рабоце кафедры, скіравалі ўвагу на нявырашаныя праблемы.

Вялікая размова, у прыватнасці, адбылася аб стылі работы партгрупорга і загадчыка кафедры. Былі выказаны канкрэтныя прапановы, накіраваныя на далейшае павышэнне баявітасці партгрупы ў рашэнні задач, якія стаяць перад калектывам кафедры.

Па-дзелавому прайшоў справаздачна-выбарны сход і ў партгрупе кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства. З дакладам па ім выступіла Т. Л. Мартынюк. У спрэчках па дакладу камуністы ўзнялі шэраг важных пытанняў, якія датычаць работы кафедры, намецілі планы далейшай работы.

На геафаку найбольш цікава прайшоў справаздачна-выбарны сход у партгрупе кафедры геалогіі і глебазнаўства (партгрупорг М. К. Чартко).

Справаздачна-выбарныя сходы адбыліся таксама ў партгрупах на кафедры біяхіміі, аддзялення палітэканоміі гістфака, кафедры рускай мовы філфака і ў некаторых іншых партгрупах. Справаздачна-выбарныя сходы ў партгрупах працягваюцца. Яны з'яўляюцца падрыхтоўкай да справаздачна-выбарных сходаў пярвічных партарганізацый БДУ.

Л. АНДРЭЕВА.

# XXXV студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 108-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна

## ТРАДЫЦЫЙНЫ ДЗЕНЬ НАВУКІ







Адзін з дзён, калі збіраецца разам у поўным саставе гістарычны факультэт, — традыцыйны Дзень навукі. Вось і 12 красавіка гэтага года прафесарска - выкладчыцкі састаў, больш як 800 студэнтаў факультэта сабралася ў 9 гадзін раніцы ў актавай зале універсітэта на пленарнае пасяджэнне XXXV студэнцкай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 108-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Тут жа госці канферэнцыі — студэнты Вільнюскага, Ерэванскага, Казанскага, Кіеўскага, Тартускага універсітэтаў.

Адкрыла канферэнцыю дэкан факультэта, прафесар І. В. Царук. З прамовай да яе ўдзельнікаў звярнуліся прарэктар універсітэта па вучэбнай рабоце, прафесар А. Я. Малышаў, старэйшы выкладчык універсітэта, ганаровы старшыня студэнцкага навуковага таварыства гістфака прафесар Л. М. Шнеерсон.

Рабочая частка канферэнцыі пачалася дакладамі А. Рубанава «У. І. Ленін аб камуністычных адносінах да працы» і А. Жураўскай «Студэнты БДУ імя У. І. Леніна ў Вялікай Айчыннай вайне».

Намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Т. Т. Дзмітрыева і прарэктар універсітэта прафесар А. Я. Малышаў уручылі ганаровыя граматы студэнтам, найбольш вызначыўшымся ў навукова-даследчай рабоце.

Пасля пленарнага пасяджэння работа канферэнцыі была прадоўжана ў 35 секцыях. Увогуле на секцыйных пасяджэннях было зроблена каля 600 дакладаў. Тэматыка самая разнастайная, пачынаючы з гісторыі першабытнага чалавека і заканчваючы лагічнымі парадоксамі.

Найбольшай папулярнасцю карысталіся секцыі гісторыі КПСС, гісторыі БССР, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, навейшай гісторыі, археалогіі і этнаграфіі, дыялектычнага матэрыялізму. Нецікавых тэм проста не было.

Увечары найбольш цікавыя моманты мінулай канферэнцыі былі адзначаны ў традыцыйным вячэрнім рэпартажы Беларускага радыё «Дзень нашага жыцця».

Вось такім быў Дзень навукі на гістфаку.

Якія ж яго вынікі?

Перш за ўсё радуе масавасць удзелу студэнтаў факультэта ў Дні навукі, ды і ў навукова-даследчай рабоце ў цэлым. Падрыхтавана каля 600 дакладаў. Лічбы гавораць самі за сябе.

Вельмі ажыўлена і зацікаўлена прайшло абмеркаванне дакладаў, якое ператварылася ў сапраўдную справаздачу студэнтаў за прабробленую імі на працягу года навуковую работу.

На больш высокі ўзровень узнялася і якасць дакладаў. Многія з іх рэкамендаваны да публікацыі, а іх аўтары — да ўзнагароджання граматамі.

Актыўны ўдзел у канферэнцыі прынялі першакурснікі. Яны не толькі з цікавасцю слухалі даклады сваіх старэйшых таварышаў. Каля 40 з іх самі выступілі са сваімі першымі навуковымі шуканнямі.

Яшчэ адна адметная асаблівасць нашага Дня навукі — яго багатая геаграфія. Казань, Ерэван, Вільнюс, Тарту, Кіеў... Нашы госці не толькі прачыталі свае паведамленні на пасяджэннях секцый, але і падзяліліся вопытам работы студэнцкіх навуковых таварыстваў у сваіх ВНУ.

А. ГРЫЦЫЯНАЎ,
А. РУБАНАЎ,
студэнты II курса гістфака.

●

На здымках: прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў уручае грамату; выступае дэкан гістфака І. В. Царук; ідзе пленарнае пасяджэнне.
Фота А. Гарбацкага.

## ВЫНІК НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

На пленарнае і секцыйныя пасяджэнні XXXV навуковай канферэнцыі студэнтаў факультэта журналістыкі было прадстаўлена 73 даклады.

Канферэнцыя падвяла вынікі навуковай дзейнасці студэнтаў за год. За гэты час у навуковай студэнцкай рабоце адбыліся значныя змены. Навуковыя работы студэнтаў сталі больш глыбокія, шырокія па ахопу і ацэнцы фактычнага матэрыялу.

Аб усім гэтым гаварыў у сваім прывітанні ўдзельнікам канферэнцыі дэкан факультэта прафесар Р. В. Булацкі.

Два дні праходзіла навукова-практычная канферэнцыя. Працавалі секцыі тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання і савецкага радыё і тэлебачання.

Сярод найбольш цікавых работ адзначаны: «Слова—думка—вобраз» студэнткі II курса Таццяны Чыгрынавай. У сваім дакладзе яна прааналізавала аспекты творчасці Я. Брыля і Ю. Бондарава. Вельмі зацікавіла прысутных работа «Мараль — ёсць праўда» студэнткі V курса Вольгі Майсевіч, у якой былі прааналізаваны маральныя праблемы творчасці В. М. Шукшына.

Шмат цікавых дакладаў было заслухана і на іншых секцыйных пасяджэннях.

І вось работа XXXV канферэнцыі падыходзіць к канцу. З заключным словам да ўдзельнікаў звяртаецца кіраўнік савета навуковага студэнцкага таварыства факультэта доктар філалагічных навук Е. Л. Бондарава. Яна прааналізавала работу канферэнцыі, выказала заўвагі некаторым даследчыкам.

У заключэнне ўдзельнікі канферэнцыі былі ўзнагароджаны памятнымі падарункамі.

С. СІНІЛАЎ,
студэнт I курса факультэта журналістыкі.

## Госці адзначаюць...

З 17 па 21 красавіка на фізічным факультэце праходзіла XXXV навуковая канферэнцыя, прысвечаная 108-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. У гэтыя дні на 12 секцыях было прачытана 250 дакладаў. У параўнанні з мінулым годам колькасць навуковых работ па грамадскіх дысцыплінах павялічылася. Са 196 дакладаў па фізіцы 10 былі на англійскай мове.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел госці факультэта — студэнты з розных ВНУ Масквы і Кіева. Увогуле канферэнцыя прайшла цікава, арганізавана, на высокім навуковым узроўні.

Старшыня студэнцкага навуковага таварыства Т. Казлова пазнаёміла нас з гасцямі. Яны падзяліліся сваімі думкамі, уражаннямі аб канферэнцыі.

**Уладзімір Шчарбінін**, студэнт V курса факультэта эксперыментальнай тэарэтычнай фізікі Маскоўскага інжынерна-фізічнага інстытута:

— Я ўпершыню прысутнічаю на навуковай канферэнцыі ў Белдзяржуніверсітэце. З вялікай цікавасцю прымаў удзел у рабоце секцыі. Прачытаў свой даклад. Хочацца адзначыць, што работа канферэнцыі была наладжана добра, усе студэнты праявілі сапраўдную зацікаўленасць. Вялікае дзякуй мінскім сябрам за цёплы прыём, за знаёмства з горадам-героем.

**Наталля Расамахіна**, студэнтка V курса факультэта эксперыментальнай тэарэтычнай фізікі МІФІ:

— Мне здаецца, было б цікава, калі б у вашай канферэнцыі прымалі ўдзел не толькі студэнты БДУ, але і студэнты іншых ВНУ г. Мінска. У нашым інстытуце на навуковых канферэнцыях сябры з маскоўскіх ВНУ прысутнічаюць абавязкова. Гэта стала ўжо традыцыяй.

**Сяргей Ражко**, студэнт V курса Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі:

— Трэба адзначыць вялікую зацікаўленасць у правядзенні канферэнцыі як выкладчыкаў, так і студэнтаў. Цікава і карысна было пазнаёміцца з арганізацыяй навуковай работы студэнтаў факультэта. Спадабалася нам таксама і газета — орган СНТ. Мне здаецца, што сувязі нашых ВНУ будуць умацоўвацца і далей. Шчыра запрашаем студэнтаў фізфака БДУ да сябе ў госці.

В. ЧАРНУШЭНКА.

## ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ СТУДЭНЦКАГА ПОШУКУ

У сапраўднае свята студэнцкай навукі ператварылася на юрыдычным факультэце навуковая канферэнцыя. На пленарным пасяджэнні выступіла з уступным словам старшыня савета па НДРС факультэта прафесар І. І. Марціновіч і падвяла вынікі навукова-даследчай работы студэнтаў за апошні час. А работа зроблена была немалая — за два дні на канферэнцыі заслухана 143 даклады і паведамленні ў 12 секцыях: дзяржавы і права, міжнароднага права, гісторыі дзяржавы і права, крымінальнага працэсу, крымінальнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, грамадзянскага права, крыміналістыкі, палітэканоміі, замежных моў, дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, адміністратыўнага і фінансавага права.

Навуковыя даклады і паведамленні былі прысвечаны актуальным пытанням прававой навукі ў СССР, рабоце дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый. У гэтай галіне трэба адзначыць такія работы, як «Пытанні аддачы пад суд у практыцы Вярхоўнага суда БССР» (Л. Зайцава, навуковы кіраўнік — прафесар І. І. Марціновіч) і «Дынамічныя мадэлі расследавання» (В. Пак, навуковы кіраўнік — прафесар А. В. Дулаў).

Сур'ёзнасцю і навуковым раскрыццём тэмы вылучаліся работы аб Асноўным Законе нашай Радзімы. У ліку лепшых даклады Н. Васько «Свабода асобы па новай Савецкай Канстытуцыі»; Т. Бармы «Новая Канстытуцыя СССР і формы камуністычнай маралі».

У абмеркаванні дакладаў удзельнічалі выкладчыкі ўсіх кафедр факультэта, у тым ліку намеснік дэкана па навуковай рабоце дацэнт І. А. Юхо, які прыняў разам са старшынёй савета СНТ факультэта В. Кошаль актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні канферэнцыі.

У гасцях у юрыстаў былі 13 студэнтаў з розных навучальных устаноў краіны. Сваіх прадстаўнікоў прыслалі: Вільнюс, Варонеж, Рыга, Алма-Ата, Львоў, Харкаў, Кіеў. Госці прынялі непасрэдны ўдзел у рабоце канферэнцыі. Вялікую зацікаўленасць выклікала паведамленне студэнткі з Варонежа Н. Рыжковай «Праблемы віктымалогіі ў крыміналістычным судаводстве». Пасля заканчэння канферэнцыі госці знаёміліся з Мінскам і яго помнікамі, наведалі музеі і тэатры, удзельнічалі ў экскурсіях у Хатынь, на Курган Славы.

За лепшыя навуковыя работы 12 студэнтаў былі ўзнагароджаны граматамі, а 36 — атрымалі падзякі. Граматы і сувеніры былі ўручаны гасцям канферэнцыі.

П. УЛАДЗІМІРАЎ.

ПЕСНЯ... Слова, якое па-рознаму гучыць на розных мовах, але аднолькава блізкае людзям усёй планеты. Ёсць песні, якія з першых дзён свайго нараджэння заваёўваюць папулярнасць, аблятаюць кантыненты, становяцца сусветнымі. Гэта — песні пра рэвалюцыю, песні салідарнасці, песні — набаты супраць вайны.

Вось і сёння песня сабрала ў актавай зале галоўнага корпуса моладзь розных кантынентаў. Ідзе традыцыйны вясновы фестываль самадзейнай мастацкай творчасці замежных студэнтаў у Мінску. Ансамблі песні і танца, танцавальныя, харавыя калектывы асноўных і падрыхтоўчага факультэтаў універсітэта трымаюць экзамен перад аўтарытэтным журы і шматлікай студэнцкай publікай. Сваё майстэрства замежныя студэнты прысвяцілі Радзіме Кастрычніка — першай у свеце Краіне Саветаў.

# З намі—маладосць планеты

— Агляд-конкурс праходзіць паэтапна, — расказвае прарэктар па рабоце з замежнымі студэнтамі Іван Пятровіч Чэпа. — Права ўдзельнічаць ва універсітэцкім фестывалі прадастаўлена пераможцам аглядаў-конкурсаў, якія напярэдадні правялі ў сябе студэнты зямляцтваў асноўных факультэтаў і студэнты падрыхтоўчага факультэта.

Удзельнікі фестывалю — гэта прадстаўнікі звыш 16 краін свету. У іх праграме каля 30 нумароў.

— Мне вельмі падабаюцца рускія народныя песні. З імі я пазнаёміўся ў Савецкім Саюзе і палюбіў іх за ласкавую цеплыню, своеасаблівую журботнасць, — гаворыць студэнт падрыхтоўчага факультэта з Гвінеі Мака Айаі П'ер Гантран. — Сёння, і мне гэта прыемна, я ўпершыню буду выконваць рускія народныя песні на сцэне.

Ад паднявольнай, рабскай працы — шлях адзіны. Мы ведаем — гэта няспынная барацьба — сцвярджае народная рэвалюцыйная песня ў выкананні студэнтаў з Конга.

Песня крочыць па в'етнамскай зямлі, якая яшчэ не адпачыла ад выбухаў. Зямлі, палітай крывёю. Зямлі, на якой не спыняецца жыццё. В'етнамскі народ будуе, в'етнамскі народ сее, в'етнамскі народ кахае—расказвае народная песня В'етнама «Я і зорачка», якую выканаў студэнт з паўднёвага В'етнама Нгуен Ван Х'ен.

Чылі... Да бою кліча сцяг Альендэ!
**«Венсеремос,
венсеремос! —
это значит, что мы победим** —
гучыць свабодалюбівая песня чылійскіх патрыётаў. Спевакоў ансамбля, студэнтаў з Лацінскай Амерыкі, падхоплівае зал.

У захапленні гледачы і ад выканаўчага майстэрства інтэрнацыянальнага хору падрыхтоўчага факультэта, які з натхненнем выканаў песню «И вновь продолжается бой...».

А які канцэрт без танцавальных нумароў? Агністым нацыянальным танцам радуюць гледачоў і танцоры — студэнты з Лівана.

Жартаўліва і жыва гучаць народныя песні ў выкананні ансамбля студэнтаў з ЧССР.

Глыбокае ўражанне пакінуў вакальны дуэт студэнтак з ПНР. Анежа Місяшэк і Іда Мазур выразна і цікава перадалі своеасаблівы каларыт кожнай песні на трох мовах.

Песні... Іх шмат гучала ў гэты вечар. Сцішана задумлівыя змяняліся раздольнымі. Усе яны, сатканыя ў адну, прагучалі ў зале вялікай, хвалюючай песняй салідарнасці моладзі.

Фестываль самадзейнай мастацкай творчасці замежных студэнтаў не закончыўся, ён толькі набірае ўзлёт. А пераможцы? Іх шмат. Сярод іх і тыя, пра каго мы расказалі.

**М. КУРГАНСКІ.**

# ВУЧОНЫ, ПЕДАГОГ, ПРАПАГАНДЫСТ

У гісторыі беларускай савецкай навуковай думкі адна з яркіх старонак належыць прафесару А. І. Лур'е — вучонаму - эканамісту, сучасніку і ўдзельніку Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, члену партыі з 1918 года.

З першых дзён Савецкай улады А. І. Лур'е — яе актыўны будаўнік. Адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі (яму тады ішоў 22 год) ён узначальвае Бабруйскі аддзел народнай асветы, адначасова працуе сакратаром павятовага выканкома Савета рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Са жніўня 1919 года — на паўднёвых франтах грамадзянскай вайны і толькі з 1921 года зноў на мірным будаўніцтве. Працуе выкладчыкам Цэнтральнай саўпартшколы ў Мінску, прарэктарам Камуністычнага універсітэта. Шмат сіл аддае арганізацыі навукі: узначальвае аспірантуру Акадэміі навук БССР, інстытута народнай гаспадаркі, БДУ імя У. І. Леніна. У 1925 годзе арганізуе кафедру палітычнай эканоміі ў БДУ, загадчыкам якой працуе да канца свайго жыцця (А. І. Лур'е пражыў 53 гады, памёр у 1948 годзе).

Усё жыццё, вялікія здольнасці вучонага - камуніста, педагога, прапагандыста марксісцка - ленінскіх ідэй аддаў ён партыі і народу, выхаванню партыйных, савецкіх работнікаў, настаўнікаў, работнікаў навукі і культуры. Тысячы яго выхаванцаў працуюць па ўсёй Беларусі, з любоўю і павагай успамінаюць свайго настаўніка. Яго лекцыі заўсёды былі творча арыгінальныя, бліскуча эрудзіраваныя, прасякнутыя страснай партыйнасцю.

Істотны ўклад унёс А. І. Лур'е ў развіццё эканамічнай навукі. У паслякастрычніцкія гады, калі палітычная эканомія сацыялізму фарміравалася як навука, прафесар А. І. Лур'е актыўна распрацоўваў многія яе важныя аспекты — аграрныя адносіны і аграрнае пытанне пры сацыялізме, станаўленне сацыялістычных вытворчых адносін у горадзе і вёсцы і інш. Ён аўтар многіх прац, апублікаваных у навуковых і перыядычных выданнях Беларусі.

Мінула трыццаць гадоў, як не стала прафесара А. І. Лур'е. Але ўдзячныя вучні памятаюць яго як прыклад самаадданай працы і творчасці на карысць савецкім людзям.

**З. ДУДЗІЧ,**
**прафесар, загадчык кафедры палітэканоміі БПІ,**
**Л. ШНЕЕРСОН,**
**прафесар, загадчык кафедры новай і навейшай гісторыі БДУ,**
**Э. ЮШКЕВІЧ,**
**дацэнт кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў БДУ,**
**Ф. НЯЧАЙ,**
**прафесар, доктар гістарычных навук.**





**На фізічным факультэце прайшла канферэнцыя чытачоў па трылогіі вядомага беларускага пісьменніка У. Новікава «Мінскі фронт» («Руіны страляюць ва ўпор», «Да світання блізка», «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску»). Разам з аўтарам трылогіі на сустрэчы прысутнічалі і яе героі А. Матусевіч, В. Суслава, Н. Ступін.**

**Госці выступілі з цікавымі ўспамінамі. Сваімі пачуццямі, уражаннямі аб прачытаных кнігах падзяліліся студэнты.**

**А. МАРЧУК.**

**НА ЗДЫМКАХ: выступае А. МАТУСЕВІЧ; з цікавасцю слухаюць выступленне І. НОВІКАВА.**

Фота А. Веруша.

# «Гарантую жыццё»

Фільм пачынаецца падзелавому, напружана: аэрадром, самалёт на старце, гул рухавікоў. Ідзе паўсядзённае працоўнае жыццё аэрадрома. Але гэта толькі здаецца спачатку, а на самай справе гэта пярэдні край, на якім працуюць выпрабавальнікі.

Так пачынаецца новы фільм рэжысёра Барыса Сцяпанава «Гарантую жыццё», пастаўлены па сцэнарыю Ірыны Пісьменнай, Рамана Раманава і Івана Чарных на кінастудыі «Беларусьфільм».

— Са здзіўляючымі людзьмі, характарамі моцнымі, незвычайнымі звёў мяне лёс,— расказвае Барыс Сцяпанаў. — Спачатку гэта быў літаратурны матэрыял, а потым рэальныя, жывыя людзі, з якімі я сустракаўся ў спецыяльных інстытутах, на заводах, аэрадромах. Выпрабавальнікі катапульт і іншых сродкаў вызвалення сучасных лятальных апаратаў ідуць наперадзе усякай новай справы ў авіяцыі, наперадзе нават лётчыкаў-выпрабавальнікаў. Ствараючы сродкі вызвалення для іншых, яны вымушаны рызыкаваць сваім жыццём. Таму было вельмі цікава даследаваць духоўны свет гэтых людзей, паспрабаваць зразумець іх псіхалогію.



**На здымку: кадр з фільма.**

Дзмітрый Радкевіч — герой фільма — чымсьці падобны на выпрабавальніка парашутаў і катапульт Валянціна Данілевча, мінчаніна, майстра спорту, рэкардсмена свету, інжынера, які загінуў некалькі год назад пры выпрабаванні катапульты...

Міця — так усе клічуць яго ў фільме — раскрываецца перад гледачом як бы праз прызму сваёй нялёгкай прафесіі. Гэта цяжкая задача для рэжысёра — раскрыць характар героя, праца якога звязана з асваеннем космасу, пранікненнем на дно акіяна, стварэннем навейшых лятальных апаратаў. У фільме шмат тэхнікі, многа гаворыцца аб тэхніцы, але перш за ўсё гэта расказ аб чалавечым лёсе, аб перамогах і расчараваннях, аб каханні і сяброўстве, і расказ не толькі пра Міцю Радкевіча, але і пра людзей, з якімі яго звёў лёс і на якіх назаўсёды застаўся водбліск яго асобы — таму, што побач з ім кожны станавіўся лепш і чысцей. І ўсё ж такі Міцю нельга назваць ідэальным героем. Ён— наш сучаснік, чалавек супярэчлівы і захапляючыйся. Як бы вачыма Міці мы бачым зямлю з вышыні птушынага палёту, адчуваем хараство вольнага падзення і радуемся пасля кожнага скачка. І разумеем, што для Міці неба—гэта ўсё. З-за яго ён кідае медыцынскі інстытут, хаця супраць гэтага пярэчыць маці.

Міцю Радкевіча іграе ў фільме малады акцёр Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя У. У. Маякоўскага Аляксандр Фацюшын.

Вобраз Міці Радкевіча ў карціне як бы аднаўляецца з расказаў яго блізкіх, сяброў і таварышаў па рабоце — адсюль і навелістычная форма пабудовы фільма. Кожная з навэл адкрывае новую грань характару чалавека незвычайнага, непаўторнага.

Ролю сябра Міці, Максіма Стральцова, іграе таксама малады, але ўжо вядомы па тэатральных работах у Ленінградскім Вялікім драматычным тэатры імя А. М. Горкага артыст Юрый Дземіч. У Максіма складаныя адносіны з Міцем. Ён і пасмейваецца над ім, і зайздросціць яму, і шалёна спрачаецца. Але прыйдзе час — і іменна Максім зойме месца ў кабіне самалёта і ўзнімецца ў паветра, каб прадоўжыць справу, пачатую Дзмітрыем Радкевічам.

«Здымаць карціну, — гаворыць рэжысёр, — нам дапамагалі сябры Валянціна Данілевіча— вядомыя спартсмены, выпрабавальнікі парашутаў. Сярод іх — Эрнэст Севасцьянаў, заслужаны майстар спорту, рэкардсмен свету, здзіўляюча мяккі і абаяльны чалавек. Ён выканаў каля 4000 скачкоў. Эрнэст Севасцьянаў дубліраваў Аляксандра Фацюшына ў паветры».

У мірным небе загінуў чалавек. Загінуў для таго, каб не гінулі іншыя. Якім ён быў — гэты наш сучаснік, чаму ён не мог жыць без сваёй небяспечнай працы, якая была для яго галоўнай у жыцці? На гэтыя пытанні дае адказ фільм.

**У. СІЗ.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 03214 Тыраж 2000 экз. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Зак. № 707.